МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
Кафедра паліталогіі

МАМЕКІН Міхаіл Сяргеевіч

# ФАРМІРАВАННЕ І ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ ПАРТЫЙНАЙ СІСТЭМЫ РЭСПУБЛІКІ ПОЛЬШЧА

Магістэрская дысертацыя
спецыяльнасць 1-23 80 07 Паліталогія

Навуковы кіраўнік
Рашэтнікаў Сяргей Васільевіч
доктар палітычных навук, прафесар

Навуковы кансультант
Захарава Наталля Яўгенаўна
кандыдат філасофскіх навук, дацэнт

Дапушчаны да абароны
«____» _____2020 г.
Заг. кафедры паліталогіі
Антановіч Ніна Арсеньеўна
Доктар палітычных навук, дацэнт

Мінск, 2020

# УВОДЗІНЫ

Праблематыка палітычных партый і партыйных сістэм традыцыйна займае важнае месца ў палітычнай тэорыі. Палітычныя партыі з'яўляюцца неабходным элементам сучаснай палітычнай сістэмы і адыгрываюць значную ролю ў палітычным працэсе.

Падчас сваёй дзейнасці палітычныя партыі ўступаюць у пэўныя адносіны адна з адной, а таксама з дзяржавай і іншымі палітычнымі інстытутамі. Партыйная сістэма ўяўляе сабою механізм узаемадзеяння і саперніцтва партый у змаганні за ўладу і яе ажыццяўленне. Гэтым паняццем ахопліваецца сукупнасць існуючых у краіне партый і прынцыпы ўзаемаадносін паміж імі.

Задачы партыйнай сістэмы варта адрозніваць ад задач палітычных партый. Палітычныя партыі прадстаўляюць інтарэсы пэўных сацыяльных груп насельніцтва і, удзельнічаючы ў барацьбе за дзяржаўную ўладу, адстойваюць іх. Партыйная сістэма ж заклікана забяспечыць адлюстраванне і прадстаўніцтва інтарэсаў усіх сацыяльных груп, пластоў, класаў і знаходжанне згоды паміж імі для захавання і гарманічнага развіцця ўсяго грамадства.

Характар і асаблівасці партыйнай сістэмы той ці іншай краіны абумоўлены мноствам фактараў – расстаноўкай сацыяльна-класавых сіл, ступенню палітычнай сталасці грамадства, узроўнем палітычнай свядомасці і культуры, гістарычнымі традыцыямі, нацыянальным складам, рэлігійнай сітуацыяй і інш. Істотнае ўздзеянне на фарміраванне партыйнай сістэмы аказвае дзеючае заканадаўства і, у першую чаргу, выбарчае права.

Як паказвае досвед палітычнага развіцця, аптымальнай формай і ўмовай дэмакратычнага развіцця грамадства выступаюць шматпартыйныя (двухпартыйныя) сістэмы. Іх адметнай асаблівасцю з'яўляецца адсутнасць манаполіі на ўладу з боку адной партыі і існаванне рэальнай палітычнай апазіцыі.

Выбар намі партыйнай сістэмы Рэспублікі Польшча ў якасці аб'екта аналізу абумоўлены тым, што сярод краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, палітычныя партыі якіх на працягу дзесяцігоддзяў былі выключаны з кантэксту развіцця канкурэнтных партыйных сістэм, менавіта Польшча з’яўляецца яскравым прыкладам паспяховай “посткамуністачнай” партыйнай трансфармацыі. Пасля палітычных пераўтварэнняў партыйная сістэма Рэспублікі Польшча была найбольш нестабільнай сярод усіх краін рэгіёна, тут часцей за ўсё змянялася заканадаўства, даўжэй за ўсё захоўваліся рудыменты посткамуністычнага характару партыйнай сістэмы, але нягледзячы на гэта ў Польшчы працэс палітычнай трансфармацыі апынуўся

найбольш паспяховым і паслядоўным, што дазволіла шэрагу даследчыкаў назваць гэту краіну “лідарам змен”.

У апошнія гады азначыліся пэўныя змены ў канфігурацыі партыйнай сістэмы Польшчы. Сучасныя тэндэнцыі партыйнага развіцця краіны адлюстроўваюць трансфармацыю партый ва ўмовах пераходу да постіндустрыяльнага грамадства. Партыі адаптоўваюцца да змен палітычнага асяроддзя, мадыфікуючы сваю арганізацыйную структуру, праграмныя ўсталёўкі і паводніцкія мадэлі.

Вывучэнне партыйнай сістэмы Рэспублікі Польшча дазваляе зрабіць высновы аб некаторых агульных заканамернасцях развіцця партыйных сістэм, якія могуць знайсці практычнае ўжыванне ў Рэспубліцы Беларусь і іншых постсацыялістычных краінах.

**Актуальнасць** магістэрскай дысертацыі абумоўлена важнасцю палітычных партый у жыцці грамадства і здзяйсненні дзяржаўнай улады, а таксама асаблівасцямі гістарычнага развіцця польскай партыйнай сістэмы і яе функцыянавання на сучасным этапе.

**Аб'ектам** даследавання з'яўляецца партыйная сістэма Польшчы.

**Прадмет даследавання** – станаўленне і развіццё партыйнай сістэмы Рэспублікі Польшча.

**Мэтай** работы з’яўляецца вывучэнне сутнасці і адметных асаблівасцяў партыйнай сістэмы Рэспублікі Польшча і тэндэнцый яе развіцця. Для дасягнення мэты ў рабоце неабходна вырашыць наступныя навукова-даследчыцкія **задачы**:

- вызначыць асноўныя падыходы да разумення паняццяў “палітычная партыя”, “партыйная сістэма”;
- выявіць перадумовы і ўмовы фарміравання партыйнай сістэмы Рэспублікі Польшча;
- прасачыць асноўныя этапы станаўлення і развіцця польскай партыёмы;
- даць характарыстыку асноўным палітычным партыям Польшчы;
- раскрыць асноўныя тэндэнцыі і перспектывы развіцця палітычных партый і партыйнай сістэмы Польшчы ўвогуле на сучасным этапе.

**Крыніцамі** для напісання магістэрскай дысертацыі паслужылі нарматыўна-прававыя) акты Рэспублікі Польшча, праграмныя дакументы польскіх палітычных партый, выступленні партыйных лідараў, а таксама статыстычныя дадзеныя і вынікі сацыялагічных даследаванняў. Былі вывучаны работы І.І. Жукоўскага, Л.С. Лыкошынай, В.М. Майоравай, Я.А. Пашкоўскага, І.С. Яжбароўскай, навуковыя публікацыі польскіх даследчыкаў А. Анташэйскага, Е.Вятра, В.Сокула, А.Сцемпень-Кучынскай і інш.

**Метадалагічную аснову** даследавання складаюць, перш за ўсё, праблемна-гістарычны метад, а таксама івэнт-аналіз, ужыванне якіх дазволіла прасачыць генезіс партыйнай сістэмы Рэспублікі Польшча, грамадска-гістарычную абумоўленасць развіцця польскай партыёмы і палітычных партый краіны, а таксама асноўныя этапы станаўлення партыйнай сістэмы Рэспублікі. З дапамогай сістэмнага метаду разгледжаны месца і роля палітычных партый, а таксама ўсёй партыёмы ў цэлым у межах палітычнай сістэмы Рэспублікі Польшча. Ужыванне структурна-функцыянальнага метаду дазволіла шляхам падзелу сістэмы на асобныя часткі даследаваць палітычныя партыі і партыйныя кааліцыі, іх функцыянальныя асаблівасці і ролю падчас прыняцця рашэнняў у палітычнай сістэме Польшчы. Параўнальны метад дапамагае высвятліць палітычную прыроду розных палітычных партый Польшчы, паказаць агульныя заканамернасці і асаблівасці іх развіцця. Метад SWOT-аналізу дазволіў вызначыць стратэгіі далейшага развіцця і дзейнасці пэўных палітычных партый.

Шырокае ўжыванне атрымалі таксама агульнанавуковыя метады: дэдукцыя, аналіз, індукцыя, сінтэз, параўнанне, абстрагаванне і абагульненне.

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

Тэма магістэрскай дысертацыі: «Фарміраванне і тэндэнцыі развіцця партыйнай сістэмы Рэспублікі Польшча».

Магістэрская дысертацыя складаецца з уводзін, чатырох главаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц (92 найменні). Аб'ём дысертацыі складае 87 старонак.

**Аб'ект даследавання** – партыйная сістэма Рэспублікі Польшча.

**Мэта работы** – вывучэнне сутнасці і адметных асаблівасцяў партыйнай сістэмы Рэспублікі Польшча і тэндэнцый яе развіцця.

**Метадалагічную аснову** даследавання склалі сістэмны, параўнальны і структурна-функцыянальны метады. Былі ўжыты праблемна-гістарычны метад, а таксама івэнт-аналіз і SWOT-аналіз. У даследаванні аўтар абапіраецца на агульналагічныя метады: дэдукцыя, аналіз, індукцыя, сінтэз, абстрагаванне і абагульненне.

**Ключавыя словы:** ПАЛІТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ, ПАРТЫЙНАЯ СІСТЭМА, ПАРТЫЙНАЯ КААЛІЦЫЯ, ІДЭАЛОГІЯ, ВЫБАРЧАЯ СІСТЭМА, ВЫБАРЫ, ПАРЛАМЕНТ, САЛІДАРНАСЦЬ, ПРАВЫ ПАВАРОТ, ПРАВА І СПРАВЯДЛІВАСЦЬ, ГРАМАДЗЯНСКАЯ ПЛАТФОРМА.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна:** прааналізаваны падыходы да вывучэння партый і партыйных сістэм; даследаваны асноўныя этапы станаўлення і развіцця партыйнай сістэмы Рэспублікі Польшча; праведзена класіфікацыя палітычных партый краіны; даследаваны ідэалагічныя ўсталёўкі партый і палажэнні іх праграмных дакументаў; прааналізаваны асноўныя асаблівасці і тэндэнцыі развіцця партыйнай сістэмы Польшчы.

Вынікі дысертацыі могуць быць выкарыстаныя пры дайлешай распрацоўцы гэтай праблемы і ў навучальным працэсе.

Магістэрская дысертацыя выканана аўтарам самастойна, высновы з'яўляюцца верагоднымі.

# ОБЩАЯ ХАРАКТЕРИСТИКА РАБОТЫ

Тема магистерской диссертации: «Формирование и тенденции развития партийной системы Республики Польша».

Магистерская диссертация состоит из введения, четырёх глав, заключения, списка использованных источников (92 наименования). Объем диссертации составляет 87 страниц.

**Объект исследования -** партийная система Республики Польша.

**Цель работы** - изучение сущности и отличительных особенностей партийной системы Республики Польша и тенденций ее развития.

**Методологическую основу** исследования составили системный, сравнительный и структурно-функциональный методы. Были применены проблемно-исторического метод, а также ивент-анализа и SWOT-анализ. В исследовании автор опирается на общелогические методы: дедукция, анализ, индукция, синтез, абстрагирование и обобщение.

**Ключевые слова:** ПОЛИТИЧЕСКАЯ ПАРТИЯ, ПАРТИЙНАЯ СИСТЕМА, ПАРТИЙНАЯ КОАЛИЦИИ, ИДЕОЛОГИЯ, ИЗБИРАТЕЛЬНАЯ СИСТЕМА, ВЫБОРЫ, ПАРЛАМЕНТ, СОЛИДАРНОСТЬ, ПРАВЫЙ ПОВОРОТ, ПРАВО И СПРАВЕДЛИВОСТЬ, ГРАЖДАНСКАЯ ПЛАТФОРМА.

**Полученные результаты и их новизна:** проанализированы подходы к изучению партий и партийных систем; исследованы основные этапы становления и развития партийной системы Республики Польша; проведена классификация политических партий страны; исследованы идеологические установки партий и положения их программных документов; проанализированы основные особенности и тенденции развития партийной системы Польши.

Результаты диссертации могут быть использованы при дальнейшей разработке данной проблемы и в учебном процессе.

Магистерская диссертация выполнена автором самостоятельно, выводы являются достоверными.

# GENERAL CHARACTERISTICS OF THE WORK

The theme of the master’s thesis: «Formation and the tendencies of development of party system of the Republic of Poland».

Master’s thesis consists of introduction, four chapters, conclusion, bibliography (92 sources). The volume of the thesis is 87 pages.

**The object of study** - the party system of the Republic of Poland.

**The purpose of the work** is the nature and the distinctive features of the Republic of Poland party system and its development trends.

**The methodological basis** of the research is based on the system, comparative and structural-functional methods. The problem-historical method, as well as event analysis and SWOT analysis were applied. In the research, the author relies on general logical methods: deduction, analysis, induction, synthesis, abstraction and generalization.

**Key terms of the thesis:** POLITICAL PARTY, PARTY SYSTEM, PARTY COALITION, THE IDEOLOGY, THE ELECTORAL SYSTEM, THE ELECTIONS, PARLIAMENT, SOLIDARITY, RIGHT TURN, LAW AND JUSTICE, CIVIC PLATFORM.

**The obtained results and their novelty:** approaches to the study of parties and party systems were analyzed; the main stages of formation and development of the party system of the Republic of Poland were investigated; the classification of political parties of the country was carried out; ideological installations of parties and positions of their program documents were investigated; the main features and tendencies of development of the party system were analyzed.

The results of the thesis can be used in the further development of this problem and in the educational process.

Master’s thesis is done independently by the author, the findings are reliable.